Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “ГРАМАТЫЧНАЯ КАТЭГОРЫЯ АСОБЫ ДЗЕЯСЛОВА”

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01 Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск
2019

РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ

**1. Тэарэтычны раздзел**

1.1. Формы асобы, іх значэнне і ўжыванне

1.2. Сувязь катэгорыі асобы з катэгорыямі ладу і часу

1.3. Ужыванне адных формаў асобы ў значэнні другіх

1.4. Безасабовыя дзеясловы, іх семантычныя і граматычныя асаблівасці. Асабовыя дзеясловы ў значэнні безасабовых

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычныя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 1. Тэарэтычны раздзел

## 1.1. Формы асобы, іх значэнне і ўжыванне

Катэгорыя ***асобы*** паказвае на адносіны дзеяння і яго ўтваральніка (суб'екта) да таго, хто гаворыць. Гэтыя адносіны граматычна выражаюцца:

Асабовымі канчаткамі дзеясловаў у формах цяперашняга і будучага часу абвеснага ладу і ў формах загаднага ладу*: буду-ю, пабуду-ю; буду-еш, пабуду-еш; буду-е, пабуду-е; буду-ем, пабуду-ем; буду-еце, пабуду-еце;буду-юць, пабуду-юць і будуй, пабудуй; буду-ем! пабуду-ем!;*

асабовымі займеннікамі ў формах прошлага часу абвеснага ладу і ў формах умоўнага ладу: *я будаваў, будаваў бы; ты будаваў, будаваў бы; ён будаваў, будаваў бы; мы будавалі, будавалі б; вы будавалі, будавалі б; яны будавалі, будавалі б*;

спалучэннем асабовых займеннікаў ці назоўнікаў і асабовых канчаткаў дзеяслова ў формах цяперашняга і будучага часу і ў формах загаднага ладу: *я пiш-у, ты прыняс-еш, вы зайгра-еце, хлопчык дапамага-е, касцы скос-яць*;

назоўнікамі і субстантываванымі часцінамі мовы для абазначэння 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку: вучаніца адказвала, вучні адказвалі. Дзеяслоў мае формы трох асоб адзіночнага і множнага ліку – першую, другую, трэцюю. ***1-я асоба*** паказвае, што ўтваральнікам дзеяння з'яўляецца той, хто гаворыць: *я думаю, чытаю, іду, пазнаю*. ***2-я асоба*** паказвае, што ўтваральнік дзеяння той, да каго звяртаюцца з мовай: *ты думаеш, чытаеш, ідзеш.* 3-я асоба паказвае, што ўтваральнік дзеяння той, хто не ўдзельнічае ў размове: *ён думае, чытае, ідзе*. Формы множнага ліку сваім лексічным значэннем не адрозніваюцца ад форм адзіночнага ліку, а маюць адрозненні, аднолькавыя з тымі, якія існуюць у асабовых займенніках: *я думаю* абазначае, што дзеянне ўтварае адна гаворачая асоба, а *мы думаем* – гаворачая асоба і хтосьці яшчэ.

Катэгорыя асобы мае спецыяльны фармальны паказчык – асабовыя канчаткі: *хадж-у, ходз-іш, ходз-іць, ходз-іце, ходз-яць*.

## 1.2. Сувязь катэгорыі асобы з катэгорыямі ладу і часу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Формы асобы дзеяслова звязаны з часам, ладам і лікам. Паводле значэння і ўжывання з асабовымі дзеясловамі суадносяцца асабовыя займеннікі *я, ты, ён (яна, яно), мы, вы, яны*: *я пішу, ты пішаш, ён (яна, яно) піша; мы пішам, вы пішаце, яны пішуць*. Дзеясловы прошлага часу і ўмоўнага ладу форм асобы не маюць. На асобу ў гэтых выпадках паказваюць асабовыя займеннікі ці назоўнікі: *я рашаў, ты рашаў, ён рашаў, яны рашалі; вучань рашаў, вучні рашалі*.

## 1.3. Ужыванне адных формаў асобы ў значэнні другіх.

У моўнай практыцы некаторыя дзеясловы не ўжываюцца ў форме 1-й і 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку. Адсутнасць форм 1-й і 2-й асобы ў гэтых дзеясловах тлумачыцца іх лексічным значэннем: дзеянне, якое яны выражаюць, нельга аднесці да асобы наогул. Некаторыя дзеясловы абазначаюць дзеянне, уласцівае жывёлам, раслінам, прадметам, з'явам прыроды: *блізіцца, згуртавацца, збегчыся, несціся (пра птушак), зелянець, прыгарэць, яснець, мутнець*.

Асабовыя формы дзеяслова апрача прамых могуць мець пераносныя значэнні.

Форма 1-й асобы адзіночнага і множнага ліку можа мець абагульнена-асабовае значэнне: *Чужую бяду рукамі развяду, а да сваёй розуму не прыкладу* (Прык.).

Форма 1-й асобы множнага ліку можа ўжывацца ў значэнні 1-й асобы адзіночнага ліку: *"Героем будзь, ваякаю слаўным". – "Ды ўжо ж, як-небудзь мо' не падкачаем…"*(Лыньк.).

Форма 2-й асобы адзіночнага ліку можа мець абагульненае значэнне: *Часам так хочацца ад душы пагутарыць з людзьмі, а пачнеш і скамечыш, не ўмееш сказаць усяго, што адчуваешш і думаеш* (Шам.).

Форма 2-й асобы множнага ліку ўжываецца пры ветлівым ці афіцыйным звароце да аднаго субяседніка: *Гатоў, панічыку, чай: выпіце ды спачывайце сабе, бо вы ж з дарогі* (К-с).

Форма 3-й асобы множнага ліку можа мець абагульненае значэнне: *Агранома хваляць не за плакаты, а за тое, як багацеюць хаты* (Прык.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### 1.4. Безасабовыя дзеясловы, іх семантычныя і граматычныя асаблівасці. Асабовыя дзеясловы ў значэнні безасабовых

Безасабовыя дзеясловы абазначаюць дзеянне (стан), якое адбываецца само па сабе, без утваральніка дзеяння. Пры такіх дзеясловах не можа быць дзейніка. Яны выступаюць выказнікамі ў безасабовых сказах: *Неба зацягнула нізкімі хмаркамі…* (Шам.).

Безасабовыя дзеясловы не маюць катэгорыі асобы, не змяняюцца па ліках і родах. Яны ўжываюцца ў цяперашнім, прошлым і будучым часе абвеснага ладу: *змяркаецца, змяркалася, будзе змяркацаца*. У цяперашнім часе безасабовыя дзеясловы супадаюць з формай 3-й асобы адзіночнага ліку: *світае* і *чытае*, *вечарэе* і *разумее*, а ў прошлым часе – з формай ніякага роду: *цямнела, падмарожвала*. Безасабовыя дзеясловы могуць мець форму ўмоўнага ладу і інфінітыва: *хутчэй вечарэла б*; *засыпала б зямлю сняжком*; *нездаровіцца, змяркацца*.

Безасабовывя дзеясловы разнастайныя паводле значэння. Яны абазначаюць:

- розныя з'явы прыроды: *халадае, світае, вечарэе*;

- псізхічны і фізічны стан чалавека ці жывой істоты: *хочацца, верыцца, нездаровіцца*;

- магчымасць, неабходнасць дзеяння: *спатрэбілася* (купіць), *давялося* (застацца), *пашчаслівілася* (спаткаць).

Безасабовыя дзеясловы могуць быць зваротнымі і незваротнымі: *не сядзіцца, не думаецца, не спіцца, задаждджыла, вечарэе, падмарозіла*.

Уласна безасабовых дзеясловаў у беларускай мове нямнога, але іх колькасць павялічваецца за кошт асабовых дзеясловаў, якія ўжываюцца ў безасабовым значэнні, параўн.: *Чым ішлі далей, тым усё больш цямнела* (Ткач.) – *Вечар сыходзіў на горад, паветра цямнела* (Сам.).

## 2. Пытанні да самакантролю ведаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*1. Раскажыце пра катэгорыю асобы. Якія існуюць формы асобы, ахарактарызуйце іх значэнне і ўжыванне.*

*2. Ці існуе пэўная сувязь катэгорыі асобы з катэгорыямі ладу і часу? У чым яна заключаецца?*

*3. Ці могуць ужывацца адны формы асобы ў значэнні іншых? Прывядзіце прыклады.*

*4. Што такое безасабовыя дзеясловы, назавіце іх семантычныя і граматычныя асаблівасці.*

*5. Ці могуць ужывацца асабовыя дзеясловы ў значэнні безасабовых? Адказ падмацуйце прыкладамі.*

ИЙ БГПУ

## 3. Практычныя заданні

**Заданне 1. Выпішыце сказы з безасабовымі дзеясловамі.**

Каторы дзень ідуць дажджы. Не такія дажджы, калі ўдар кожнай кроплі адчуваецца, а дробныя і ўедлівыя, быццам у небе, пад самымі хмарамі, нехта нябачны прасейвае ўсю гэтую безліч вады праз вельмі густое і далікатнае сіта. Стынуць вербалозы па калені ў вадзе, губляючы апошні зжухлы ліст. Стаяць голыя лісты, і ў лугах і ў палях пустэча, адно толькі на стагах, пад дажджом, застылі ў нерухомасці буслы — сёлетнія, яшчэ не выпрабаваныя жыццем выводкі.

Ночы золкія, пранозлівыя, халодныя. Часам, калі не бывае дажджу, выбліскваюць зоры. Яны буйнейшыя, чымся ўлетку, як факелы, палыхаюць і мігцяць сіняватым і загадкавым святлом у загадкавым бясконцым небе. Яны як бы пракладваюць людзям шлях, і хочацца глядзець і глядзець у таямнічую, поўную цудоўнага хараства глыбіню неба, у якой само сабой адгадваецца яшчэ адно невядомае жыццё. І хоць неба чыстае і не ідзе дождж, а вада ўсё роўна адчуваецца; яна ўсюды — у каляінах дарог, у нізінах і па ямінах, пад капытом у каня і ва ўласнай кішэні пінжака. Восень усе роўна спявае сваю нудную песню, цемень не хавае маўклівасці бору і навакольнай пустэчы, а вецер прыносіць вільгаць і пах завялага бульбоўніку.

**Заданне 2. Знайдзіце ў сказах безасабовыя дзеясловы, дайце ім граматычную і лексічную характарыстыку. Адзначце, у якіх сказах асабовыя формы дзеясловаў ужываюцца з безасабовым значэннем**.

1. На золку ўсё зацíхла за акном. Світала і развіднела нясмела, дыхнула з саду маладым вінoм, і ўсё наўкол было да болю бела (С. Грахоўскі). 2. Шэранню завалакло сцены Брэсцкай крэпасці (А. Вялюгін). 3. Надыходзіў вечар. Змяркалася (Я. Колас). 4. Цямнела, было суха ад лёгкага марозу і холадна (К. Чорны). 5. Зноўку павеяла холадам, сцюжай, грозна навіслі крывавыя хмары (Я. Брыль). 6. Раніцай яму [Коласу] нядужылася; «у вачах з'явіліся плямы», але ўдзень усё ж «прысеў за работу» (М. Лужанін). 7. Наступным вечарам неспадзеўкі прынесла Дубадзела (І. Мележ). 8. Цямнела ў вачах, а сэрца вугаллем пяклося ў грудзях (З. Бядуля). 9. Цягнула да цёплай печы. 10. Пахне свежым сенам на Пцічы, месяц за дубраваю знікае (С. Грахоўскі). 11. І раптам заснежыла, замільгацела — віхура лістовак зляцела на нас (П. Панчанка). 12. З балот патыхае вільгаццю, халадком (Б. Сачанка).13. Раптам наперадзе па ўсім прасторы, відным воку і схаваным за ўзгоркамі і лясамі, забухала, загрукатала (І. Мележ).

**Заданне 3. Замяніце безасабовыя дзеясловы ў сказах асабовымі**.

1. Засмужсу не хацелая падымацца з мяккай снежнай пярыны. Хацелася спаць. 2. Тут пахне рыбай і морам, салёным ветрам і водарам тайгі. 3. Мне ніяк не ўдавалася звязацца з кім-небудзь. 4. Але ёй (Ядвісі) не страшна. Ёй проста чагосьць шкада. Ёй хочацца заплакаць. 5. Не ведаю, як каму, а мне асабліва хараша думаецца ў асеннім лесе. 6. Шкада мне вас, шэрыя хвалі. 7. На сухой траве не было ні расінкі. 8. Пахне маладой зелянінай, мокрай травой.

**Заданне 4. Складзіце сказы, каб прапанаваныя дзеясловы выступалі ў адным сказе ў функцыі асабовых, а ў другім — безасабовых.**

Цягне, звініць, пякло, пацямнела, пасыпала, носіць.

**Заданне 5. Адзначце дзеясловы, якія можна лічыць неасабовымі:**

1) чырванеюць;

2) маеш;

3) разрастуцца;

4) гуляў;

5) знайду;

6) усміхаюцца;

7) забялее;

8) адчуваеш;

9) сплюшчымся;

10) адстаў.

**Заданне 6. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы безасабовыя:**

1) Няма ж нічога благога ў тым, калі чалавек ступае на адну і тую ж сцежку двойчы і калі на яго ад гэтага ***находзяць*** успаміны (М. Стральцоў);

2) ***Дыхалася*** лёгка: скрозь ляжала прывялая трава, чаруючы рознымі пахамі (І. Чыгрынаў);

3) Толькі што ***развіднела***. Па небе плылі нізкія хмары; зямля дыхала восеньскай вільгаццю (І. Навуменка);

4) За роўняддзю вялікай, зіхоткай ад усходу вады – далёкая града ці грыва лазняку. Адтуль ***чуваць*** салавей, як быццам тут ён недзе, зусім блізка (Я. Брыль);

5) ***Змянілася***, багата чаго ***змянілася*** з гэтых дзён, як прыйшоў сюды, паставіў першую хату чалавек (Б. Сачанка);

6) Хораша ***пахла*** з каляін вільготным сасновым карэннем, а з дробных хмызоў – свежым лісцем, а потым неяк нечакана і саладкавата-густа ***патыхнула*** водарам ад зламанага пры дарозе куста крушыны (М. Стральцоў);

7) За горадам яшчэ ляжаў снег і былі пратaліны, што ***пахнулі*** зямлёю... (У. Караткевіч);

8) Праўда, ***ехаць*** па вуліцы ***давялося***нядоўга, усяго напачатку, пасля дарога забірала направа і зноў знікала ў лесе (І. Чыгрынаў);

9) У першай частцы тэксту, выбітага на срэбных з пазалотаю пластках, ***паведамляецца*** пра кошт дарагіх металаў і камянёў, якія пайшлі на аздабленне крыжа, і плату, якую атрымаў сам Лазар Богша (У. Арлоў);

10) І ўсё раптам у адзін момант ***памаладзела, змянілася, ажыло*** (М. Капыловіч).

РПЕОЗИТС